На карце слаўтых і памятных мясцін Магілёўшчыны Хоцімскі раён нічым адметным не вылучаецца. Хаця і тут сустракаюцца археалагічныя помнікі, прыгожыя і багатыя лясы, маляўнічыя рэкі.

За гады Савецкай улады гэты край значна пераўтварыўся, змяніў свой воблік, сапраўдным цэнтрам культурнага жыцця стаў гарпасёлак Хоцімск.

Зараз можна назваць мноства знакамітых імёнаў ветэранаў рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, герояў першых пяцігодак, Вялікай Айчыннай вайны, перадавікоў вытворчасці, артыстаў, музыкантаў, спевакоў, мастакоў, пісьменнікаў — ураджэнцаў Хоцімскай зямлі. Шматлікія народныя таленты сімвалізуюць духоўнае абуджэнне, няспынны рост культуры савецкіх людзей.

# ЧЫМ СЛАЎНЫ РАЁН

## ЛІТАРАТУРНЫЯ МЯСЦІНЫ ХОЦІМШЧЫНЫ

У часы былой царскай Расіі Хоцімшчына ўяўляла сабой глухі куток, дзе панавала забітасць, адсталасць, галеча. Культурнае жыццё тут амаль адсутнічала. Невыпадкова ў мінулыя, дарэвалюцыйныя гады, край амаль не вылучыў ніякіх талентаў. У далёкай правінцыі дзейнічалі хіба толькі прадстаўнікі дэмакратычнай інтэлігенцыі, якая імкнулася не толькі далучыць народныя масы да духоўнага жыцця, але і ўнесці свой уласны ўклад у развіццё адукацыі, культуры. Да ліку такіх энтузіястаў можна аднесці Якава Раманавіча Брайцава (12.2.1861—2.3.1931), цяпер амаль забытага рускага празаіка, драматурга і паэта, прадстаўніка вядомай сялянскай «плеяды» пісьменнікаў. Яго можна лічыць першым прафесіянальным літаратарам — ураджэнцам прыбесядскага краю. Аб ім у БелСЭ (т. II, Мн., 1970, с. 388), прыводзяцца кароткія звесткі, з якіх вынікае, што каштоўнасць яго спадчыны даволі значная.

Паходзіў ён з сялянскай сям'і вёскі Забялышына, скончыў Клімавіцкае павятовае вучылішча, жыў на Украіне, удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях 1905 і 1917 гадоў. Працяглы час знаходзіўся пад наглядам паліцыі, зведаў горкую долю няпрызнаных пісьменнікаў-адзіночак. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў сакратаром Забялышынскага валвыканкома, павятовым пракурорам, настаўнікам. У 20-я гады супрацоўнічаў у «Крестьянской газете» (Масква), у якой друкаваў вершы і нарысы, быў членам Усерасійскага Саюза сялянскіх пісьменнікаў. Апрача таго, у савецкі час ён напісаў аповесць «Гаспадар», паэму «Дудка».

У Цэнтральным дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва БССР захоўваюцца рукапісы яго аповесцей «Няўдалічка Анюта» (1897), «Старая вёска», «Юда» (1899), камедыі «Цыганова бяда» (1905), рамана «Сярод балотаў і лясоў» (1913—1916), некалькі апавяданняў. Выходзіла асобнай кнігай яго аповесць з беларускага простанароднага жыцця «Багацеі» (1889). Твор гэты акадэмік Я. Карскі назваў «таленавітай аповесцю».

Я. Брайцаў у свой час наведаў Льва Талстога ў Яснай Паляне, апісваў жыццё роднай вёскі Забялышына, Родні, Галіча, Старай Буды, Хоцімска, павятовага горада Клімавічы. Ён паказваў сацыяльную несправядлівасць, гаротнае становішча сялян пры паншчыне, іх барацьбу з прыгнятальнікамі. У часопісе «Беларусь» (№ 9, 1966) друкавалася ў перакладзе на беларускую мову апавяданне Я. Брайцава «Дудалёва лаза» у суправаджэнні кароткай біяграфічнай даведкі.

Пахаваны Я. Брайцаў на могілках у Забялышыне, сярод аднавяскоўцаў.

Творчая спадчына яго яшчэ чакае сваіх даследчыкаў, павінны быць вывучаны і мясціны, звязаныя з яго лёсам. Цікава было б адшукаць яго магілу і аднавіць агароджу каля яе, зрабіць адпаведны надпіс.

Значна актывізавалася літаратурнае жыццё ў Хоцімску ў першыя гады Савецкай улады. Але самай памятнай падзеяй гэтага часу з'яўляецца тое, што ў Хоцімск вясной 1926 года прыязджаў Якуб Колас. З красавіка ён прысутнічаў на пленуме раённага выканаўчага камітэта, пасля заканчэння афіцыйнай часткі чытаў свае творы перад удзельнікамі пленума. Працягласць знаходжання паэта ў раёне дакладна ўстанавіць не ўдалося, але затое добра вядома, што ён уласнаручна напісаў справаздачу аб рабоце пленума і надрукаваў яе ў Калінінскай акруговай газеце «Наш працаўнік» (11 красавіка 1926 года) за подпісам «Якуб Колас». 15 красавіка 1926 года гэтая ж самая справаздача з'явілася ў «Савецкай Беларусі» пад назвай «За планавасць і гаспадарчасць» за подпісам «Я. Каласок». У Трасцінскай сельскай бібліятэцы захоўваюцца, як дарагія рэліквіі, фотакопіі гэтых артыкулаў. Асаблівую каштоўнасць уяўляе сабой фотакопія артыкула, змешчанага ў «Нашым працаўніку», паколькі архіваў гэтай газеты ў рэспубліцы не захавалася. Фотакопія даслана сюды з Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна ў Маскве па просьбе-заказу загадчыка філіяла бібліятэкі М. А. Ласоўскага. Ён у сваіх артыкулах «Якуб Колас на Хоцімшчыне» («Шлях Кастрычніка», 14 кастрычніка 1967 года) і «Незвычайны чалавек (Народны паэт — госць Хоцімшчыны)» («Шлях Кастрычніка», 19 снежня 1972 года) прыводзіць і некаторыя іншыя звесткі, звязаныя з прабываннем паэта ў Хоцімску. Паведамляецца, у прыватнасці, што дарога ў гарадскі пасёлак ляжала праз Забялышына і Трасціно, што паэт выступаў у народным доме (дом згарэў у час вайны), які размяшчаўся непадалёку ад цяперашняга РДК, што жывуць яшчэ ў раёне ўдзельнікі сустрэчы з песняром, сярод якіх ён называе пенсіянера П. П. Сычова. Думаецца, што такіх людзей можна адшукаць і больш. Менавіта яны ў стане паведаміць нам падрабязнасці, якімі суправаджалася прабыванне народнага песняра ў Хоцімску. Самыя нязначныя штрыхі, факты, імёны, падзеі, звязаныя з тым часам, могуць аказацца цікавымі і павучальнымі для сучаснікаў.

**М. НЯХАЙ,**
дацэнт кафедры літаратуры Мінскага інстытута культуры.

*(Працяг будзе).*

**Няхай, М.** Чым слаўны раён : літаратурныя мясціны Хоцімшчыны : [аб Я. Р. Брайцаве] / М. Няхай // Якуб Брайцаў [Папка газетных выразак]. — (Забялышынская СБ).